важную частку сваёй зямлі. Падзеі 1180 г. з'явіліся для Полацка бліскучай дэманстрацыяй яго ўзноўленага адзінства і баявой моцы. Гэта было і святам дальнабачнай полацкай дыпламатыі, якая змагла абараніць лёс дзяржавы ад магчымага гнёта суседзяў.

ЛІТАРАТУРА


1. Полное собраніе Русскихъ лѣтописей. Изданное по Высочайшему повелѣнию Археографическою коммиссеію. Томъ второй. Изданіе второе. Лѣтопись по Ипатскому списку. С-Петербургъ. Типографія М.А. Александрова, 1908. – 638 с.
2. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля (Очерки истории Северной Белоруссии). В IX-XIII вв. – М. : Наука. 1935. – 295 с. : ил.
3. Беляев, Д.И. Исторія Полотска, или Сѣверо-Западной Руси, отъ древнѣйшихъ временъ до Люблинской уніи / Д.И. Беляев. – М. : Въ Синодальной Типографіи, 1872. – 456 с.
4. Данилевичъ, В.Е. Очеркъ исторіи Полоцкой земли до конца XIV столѣтія / В.Е. Данилевичъ. – Кіевъ : Типографія императ. ун-та Св. Владіміра В. І. Завадскаго, Больш.-Васильковская, д. №№ 29-31. 1896. – 260 с.
5. Насевіч, В.Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы. – Мінск : Полымя, 1993. – 160 с. : іл.
6. Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь: Полац. і новагард. перыяды / М.І. Ермаловіч, прадм; М. Ткачова. – 2-е выд. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 366 с. ; іл.
7. Загорульский, Э.М. Белая Русь с середины I тясячелетия до середины XIII века / Э.М. Загорульский ; вступ. ст. В.А. Тепловой. – Изд. второе, доп. – Минск : Четыре четверти, 2014. – 532 с. : ил.
8. Новгородская лѣтопись по синодальному харатейному списку. – СанктПетербургъ : Типографія Императ. Акад. Наукъ. – 1888. – 560 с.
9. Булахов, М.Г. «Слово о плъку Игоревъ» в переводах на славянские языки XIX-XX вв. / М.Г. Булахов. – Минск : Беларус. навука, 2013. – 360 с.
10. Друцк старажытны: Да 1000-годдзя ўзнікнення горада / рэд. кал. : Г.П. Пашкоў (гал. рэдактар) [і інш.] : Маст. У.М. Жук. – Мінск : БелЭн, 2000. – 128 с. : іл.
11. Друцк: Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX – XII вв., летопись древних слоев, князья Друцкие и их владения в XIII – XVIII вв., ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников), памятники архитектуры и объекты туризма / О.Н. Левко [и др.] ; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.); науч. ред. О.Н. Левко ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2014. – 619, [5] с. : ил. – (Древнейшие города Беларуси).


**УДК 314/148(476/5)”8/12”**

## ДЭМАГРАФІЧНАЯ СТРУКТУРА НАСЕЛЬНІЦТВА ПОЛАЦКА Ў IX – СЯРЭДЗІНЕ XIII СТАГОДДЗЯЎ: ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АСПЕКТ.

***М.П. КРУПСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. Д.В. ДУК)***

Полацк як горад у сучасным разуменні гэтага слова ў канцы X - XI стст. абрастаў новымі паселішчамі і ператвараўся ў якасна новы па змесце сацыяльны арганізм - адміністрацыйна-ваенны, рэлігійны, культурны, рамесна-гандлёвы цэнтр буйнога княства Усходняй Еўропы.

Пасяленні палачан размяшчаліся і па-за межамі крапасной сцяны і былі даследаваны археалагічна. Забудова XI-XVIII стст. адкрыта на “вянцы” правага берага р. Палаты насупраць Верхняга і Ніжняга замкаў, полацкага гарадзішча [3, с. 133]. Г. В. Штыхавым таксама было вызначана, што старажытным дзяцінцам Полацка з’яўлялася гарадзішча IX ст. На правым беразе р. Палаты каля гарадзішча было размешчана паселішча-перадграддзе плошчай 0,25 га. Верхні замак пачаў засяляцца напрыканцы X ст. [5].

У выніку палявых археалагічных даследаванняў 1928, 1957, 1959-1964 гг. і 1967-1968 гг. былі атрыманы першыя даныя аб развіцці тапаграфічнай структуры Полацка, узроўні развіцця гарадскіх рамёстваў, сувязяў пасадскага насельніцтва. Д. Ул. Дук адзначае, што маштабы археалагічных раскопак тых часоў былі вельмі значнымі (усяго вывучана больш за 964 м плошчы). На жаль, большасць справаздач па выніках раскопак утрымлівае толькі агульныя звесткі пра характар культурнага пласта і колькасць знаходак у ім. Графічнае суправаджэнне справаздач (планы раскопаў, гарызантальная і вертыкальная стратыграфія, планіграфія і гарызонты размяшчэння асобных знаходак) не заўсёды адлютравана дастаткова поўна [3, с. 15].

Значную цікавасць уяўляюць пытанні дэмаграфічнай структуры Полацка на розных этапах яго існавання. Для старажытнага горада XI ст. такая спроба была ўпершыню зроблена Г. В. Штыхавым. Адносна тапаграфічнага развіцця, «посад был по меньшей мере в трёх местах, причём главная его часть (великий посад) занимала пространство между Полотой и Западной Двиной, включая Нижний замок»

[8, с. 76]. Даследчык выказаў меркаванне аб “канчанскай” структуры Полацка XI-XIII стст. На падставе параўнаўчага аналізу, з выкарыстаннем методыкі польскіх археолагаў, для горада агульная плошча дзяцінца Полацка на Верхнім замке ў XII-XIII стст. не перавышала 10 га. Агульная плошча пасада – 70-75 га. Калі прыняць плотнасць насельніцтва за 80, то на пасадзе пражывала каля 5,5-6 тыс. чалавек, і больш за 2 тыс. жыхароў магло быць на Верхнім замке, што ў вогуле складае прыкладна не больш за 10 тыс. жыхароў [2, с. 123].

Але выкарыстаны метад польскіх археолагаў не дазволіў у поўнай ступені адлюстраваць дынаміку развіцця полацкай дэмаграфіі.

Зыходзячы з таго ж метаду падліку насельніцтва ў залежнасці ад плошчы пасялення, але грунтуючыся на новых дадзеных, трэба лічыць, што ў Полацку IX-X стст. пражывала каля 6 тыс. чалавек. Дадзены метад улічваў, што склад сярэдневяковай сям’і 5 чалавек. Па другім метадзе колькасць членаў сям’і павінна лічыцца 6 чалавек.

На падставе шматгадовых археалагічных раскопак у Полацку як С. В. Тарасавым, так і папярэднікамі, з'явілася магчымасць прымянення для вырашэння дадзенай праблемы новага метаду, які быў прапанаваны П. П. Талочка. На сенняшні дзень, ён з'яўляецца найбольш дакладным. Сутнасць гэтага метада зводзіцца да двух пунктаў: 1) вызначэнне агульнай заселенай тэрыторыі горада для пэўнага перыяду; 2) вызначэнне памераў сярэднестатыстычнай гарадской сядзібы на тым ці іншым этапе і адпаведна памеры адной жылой сядзібы [4, с. 59; 1, с. 88].

С. В. Тарасаў на падставе шматгадовых раскопак і назіранняў за характарам культурнага слоя ў гістарычнай зоне Полацка гэтае пытанне вырашаў у рамках прапанаванай храналогіі развіцця гісторыка-тапаграфічнай структуры горада. У IX – пач. XI ст. агульная гарадская тэрыторыя складала 40 га. Пры гэтым даследчык улічваў, што далёка не цалкам былі заселены Запалоцце, Верхні замак і Вялікі пасад [1, с. 88].

Больш складана падлічыць памеры сярэднестатыстычнай сядзібы горада на розных этапах яго фарміравання. Для IX-X стст. трэба ўлічваць матэрыялы раскопак С. В. Тарасава 1986 г. і 1989 г., якія праводзіліся на тэрыторыі старажытнага селішча (Ніжні замак). У выніку раскопак 1986 г. С. В. Тарасавым быў ускрыты фрагмент аднаго жылога комплексу IX-X стст. [1, с. 88-89].

Аналізуя археалагічныя даследванні гісторыкаў, якія займаліся падлікам гарадскога насельніцтва горада Полацка, можна правесці разліч лічбаў на аснове наяўных данных, атрыманых С. В. Тарасавым пасля даследванняў 1986 г. Плошча першапачатковай гарадской застройкі складала каля 8 га [1, с. 88]. Памеры ускрытага фрагмента аднаго жылога комплексу IX-X стст. 36 кв. м., і на думку даследчыка даўжыня не перавышала памеры больш чым у два разы. Такім чынам памеры жылога комплексу ў раскопе 1986 г каля 70 кв. м. ці 0,007 га. З улікам раскопак 1989 г. на плошчы 400 кв. м. было выяўлена 17 мацерыковых ямаў, якія належаць, зноў такі на спасылцы С. В. Тарасава, не меней чым 4 жылым комплексам. Улічваючы данныя 1986 г. і 1989 г. можна лічыць что памер жылога комплекса не перавышаў 100 кв. м.

З улікам данных падліку колькасці насельніцтва, якія выкарыстаў С. В. Тарасаў, запазычаныя ў П. П. Талочкі, сярэдняя колькасць членаў сям’і павінна лічыцца 6 чалавек, па другому метаду 5 чалавек.

У XII — XIII стст. уласна сам горад складаўся з умацаванага дзяцінца: Верхняга замка, Вялікага і Запалоцкага пасадаў. У гэты час узнікаюць манастыры ў Бельчыцах і Сяльцэ, магчыма, на Востраве, якія, між тым, яшчэ не адносіліся да гарадской тэрыторыі [6, с. 38].

З сярэдзіны XI па XIII стст. горад дасягнуў сваіх максімальных памераў для раннефеадальнага перыяду. З улікам новых дадзеных па Вялікім пасадзе, атрыманых С. В. Тарасавым у 1986; 1987; 1988; 1990 гадах памер гарадской тэрыторыі Полацка трэба лічыць каля 120 га [6, с. 38]. Па перыяду XII-XIII стст. мы маем канкрэтны гістарычны матэрыял, які сведчыць пра характар жылой забудовы розных частак горада. Перш за ўсё гэта вынікі раскопак на Верхнім замку і на Вялікім пасадзе горада. І хоць ніводнай сядзібы цалкам не было даследавана, тым не менш па матэрыялах раскопу II (1959-60) і раскопу III (1961-62) можна скласці ўяўленне аб прыблізных памерах жылой сядзібы на полацкім Верхнім замку ці ў непасрэднай блізкасці ад яго. Улічваючы ўстойлівасць планіроўкі дадзенай тэрыторыі, можна ўявіць сабе прыкладныя памеры адной сядзібы. Пры рэканструкцыі агульная плошча сядзібы складае 228 м$^2$, ці акруглена – каля 0,03 га [7, с. 66-67; 4, с. 59-60].

Памеры дадзенай сядзібы адпавядаюць памерам сярэднестатыстычнай сядзібы Кіева XII-XIII стст. Відаць, такое супадзенне не выпадкова. У Полацку, як у Кіеве ці Ноўгарадзе, існавалі даволі істотныя адрозненні паміж сядзібнымі комплексамі, якія належалі розным па сацыяльным становішчы людзям. Сведчанне таму – сядзіба заможнага майстра-ювеліра XII ст. на Вялікім пасадзе Полацка, раскапаная ў 1987-88 гг. Таму, відаць, будзе правамерным прызнаць, што і для Полацка XII-XIII стст. плошча сярэднястатыстычнай сядзібы складала каля 0,03 га. Калі прыняць каэфіцыент шчыльнасці жылой забудовы за 60%, мы атрымаем агульную колькасць сядзіб у горадзе – 2400. Пры ўмове, што на адной сядзібе

пражывалі ў сярэднім 6 чалавек, агульная колькасць жыхароў Полацка ў XII-XIII стст. будзе складаць 14400 чалавек [7, с. 66-67; 4, с. 59-60].

З улікам найноўшых дадзеных, атрыманых Д. Ул. Дукам, атрымаем больш разгалінаваную плошчу Полацка ў XI-XV стст. Яна складаецца з асноўных тэрытарыяльных адзінак – Вялікага (каля 60 га) і Запалоцкага пасада (максімальны памер – 40 га). Верхняга замка (9, 44 га), Ніжняга замка (каля 7 га), гарадзішча – каля 2 га, паселішчаў за р. Палатой – да 50 га, Вострава – каля 8 га, Старой Слабады – каля 5 га. У выніку плошча Полацка ў XI ст. была не меншай за 180 га, у XII – XIII стст. адбываецца паступовае яе скарачэнне за кошт пасяленняў за р. Палатой і часткі Запалоцкага пасада на 70 га [3, с. 64-65]. А гэта значыць што тэррыторыя Полацка ў XII – XIII стст. скарацілася, прыкладна, да 110 га.

Трэба асобна ўзгадаць што С. В. Тарасаў, пры падліку плошчы Полацка, ўлічваў толькі тэрыторыю Верхняга замка, Вялікага і Запалоцкага пасадаў. У сваю чаргу Д. Ул. Дук, на аснове найноўшых даследаванняў, уключыў у агульную плошчу Полацка такія тэрытарыяльныя адзінкі вакольнага горада, як Ніжні замак, гарадзішча, паселішча за р. Палатой, Вострава і Старой Слабады. За кошт менавіта гэтых тэрыторый, плошча горада павялічалася не меньш чым да 180 га.

На падставе выкарыставанага гістарычнага матэрыяла, атрыманага па выніках раскопак Г. В. Штыхавым і С. В. Тарасавым, пры ўлічванні метада падліку насельніцтва сярэднявечных гарадоў Кіеўскай Русі П. П. Талочка, трэба зрабіць высновы, што ў XII-XIII стст. на гарадской частцы тэрыторыі Полацка пражывала каля 14,4 тысяч чалавек. Пры гэтым трэба канстатаваць что ў параўнанні з X-XI ст. прырост насельніцтва горада Полацка склаў больш чым у два разы (у X-XI ст. каля 6,3 тысяч чалавек). Пры ўлічванні найноўшых дадзеных, атрыманых Д. Ул. Дукам, колькасць насельніцтва горада Полацка ўXI-XIII стст. можа значна павялічвацца.

Аналізуючы пытанні, звязаныя з дэмаграфічнай структурай насельніцтва сярэднявечнага Полацка трэбы зрабіць наступныя высновы. Па-першае, дэмаграфічнае пытанне даследавана не дастаткова. Улічваючы тое, што пытаннем дэмаграфіі Полацка займаліся толькі часткова Г. В. Штыхаў. Менавіта па яго археалагічных дадзенах можна правесці прыкладны разлік колькасці насельніцтва. Больш дакладна гэтым пытаннем займаўся даследчык С. В. Тарасаў. Таму трэба адзначыць, што вышэйпералічаны разлік з’яўляецца сярэднестатыстычным. Па-другое, шчыльнасць засялення была рознай на розных участках горада. Што яшчэ больш затрудняе падлікі. З улікам найноўшых дадзеных, атрыманых Д. Ул. Дукам, плошча горада павялічваецца за кошт прылягаючай тэрыторыі, адпаведна і колькасць насельніцтва ўзрастае.

Трэба зрабіць агульныя высновы аб неабходнасці далейшых археалагічных даследванняў з мэтай ускрыцця цалкам яшчэ некалькі жылых комплексаў. Што дазволіць удакладніць атрыманыя дадзеныя з улікам методыкі падліка колькасці насельніцтва, прапанаваную ўкраінскім археолагам П. П. Талочка. Методыка падліку грунтуецца толькі на аснове археалагічных дадзеных пры поўнай адсутнасці пісьмовых крыніц, таму з’яўляецца толькі прыблізнай. Колькасць насельніцтва залежыць ад плошчы горада, якую ўлічвае даследчык пры падліку.

Методыка падлікаў вызначана і апрабіравана, застаецца праблемным пытаннем вызначэння шчыльнасці забудовы тых ці іншых частак горада Полацка. напрыклад. Запалоцкі пасад, яго заходняя частка, тут магчыма месціліся двары знаці - баяр ці рамеснікаў элітарных прафесій (ювеліраў), плошча сядзіб магла быць значна большай за сярэднестатыстычную 300 кв. м. Адапведна будуць мяняцца і разлікі.

На аснове тых даных, якія ёсць сёння, колькасць насельніцтва Полацка ў IX – сярэдзіне XIII стст. можна вызначыць у дыяпазоне ад 8 да 15 тыс. чал., што карэлюецца з даннымі па падліках насельніцтва такіх гарадоў як Кіеў і Ноўгарад.

ЛІТАРАТУРА

1. Тарасаў, С.В. Полацк X – XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 183 с. ; іл.
2. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX – XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1978. – 160 с. : ил.
3. Дук, Д.У. Полацк і палачане (IX – XVIII стст.) / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с. ; [22] арк. іл.
4. Тарасаў, С.В. Дэмаграфічная структура Полацка XI – XVII стст. Па гісторыка-археалагічных крыніцах. Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі \\ Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 1130-годдзю Полацка. – Полацк : НПГКМЗ, 1992. – 68 с.
5. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX – XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 133, [2] с.
6. Тарасаў, С.В. Сядзіба полацкіх ювеліраў XII-XIII стст. Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі \\ Матэрыялы IV Міжнар. навук. канф. – Полацк : НПГКМЗ, 2003. – 328 с. ; іл.
7. Тарасаў, С.В. Дэмаграфічная структура Полацка 9 – 11 ст. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэд. кал. : Г.П. Пашкоў (гал. рэд) і інш. ; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2002. – 912 с. ; іл.
8. Штыхов, Г.В. Города северной и центральной Белоруссии / Г.В. Штыхов \\ Очерки по археологии Белоруссии. Ч. II. – Минск : Наука и техника, 1972. – С. 73 – 95.